языка объясняют значение слова *вепрь,* обращаясь к заимствованию из тюркских языков *кабан*: «вепрь – то же, что кабан».

Словари белорусского языка фиксируют также устаревшие тюркизмы: *апанча, армяк, мсцень, таф'я*. Некоторые тюркизмы в современном белорусском языке являются историзмами: *есаул, калчан, мурза, сагайдак, янычар, ясыр.*

Тюркизмы, как и многие лексические заимствования, освоены графически, фонетически, морфологически и семантически. Они являются полноправными единицами лексической системы белорусского языка и свободно используются носителями.

Список литературы:

1. Садыкова, З.Р. Зоонимическая лексика татарского языка / З.Р. Садыкова. – Казань: Изд-во Казан. ун-та, 1994.
2. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Акад. навук БССР. Ін-т мовазнаўства / пад. рэд. В.У. Мартынава. – Мінск, 1978.

## Урач, вёска і чарнобыльская трагедыя ў аповесці В. Карамазава "Краем белага шляху"

УА "Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"

***Монід І.М., 2 к., 243 гр., ПФ***

Кафедра рускай і беларускай мовы

Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык *Ратынская Н.В.*

Яшчы ў дзяцінстве я марыў стаць урачом. Ужо тады я быў захоплены смеласцю і адказнасцю людзей самай гуманнай прафесіі. І вось нядаўна я прачытаў аповесць В. Карамазава "Краем белага шляху" і вырашыў прааналізаваць гэты твор, у якім закрануты не толькі тэма маральна-этычнага бока ўрачэбнай этыкі.

У аповесці таксама звяртаецца ўвага на такую балючую тэму для беларускага народа, як аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Таксама звернута ўвага і на тое, як жыве беларуская вёска, як паступова людзі забываюцца на свае карані, на тое, дзе яны нарадзіліся, жылі іх бацькі, дзяды і прадзеды.

Галоўную мэту сваей працы я вырашыў сфармуляваць наступным чынам: якім павінен быць урач, якія зносіны павінны быць паміж ім і тым асяроддзем, у якім ен жыве і працуе.

З гэтай фармулёўкі вынікаюць наступныя задачы працы: прааналізваць вобраз урача, які стварыў В. Карамазаў і высветліць уласныя адносіны аўтара да свайго героя; адказаць на пытанне "ці можна апраўдаць паводзіны ўрача абставінамі, у якіх ён жыве і працуе?"; высветліць адносіны вяскоўцаў да дадзенага героя і якім чынам на іх паўплывала аварыя на ЧАЭС і яе наступствы.



Репозиторий ГрГМУ

У самым пачатку твора аўтар апісвае пакой, у якім прачнуўся ўрач Валетаў. Мы бачым, што гэта звычайная хата з небагатай абстаноўкай. Ужо зараз магчыма сказаць, што фінансавае становішча ўрача жадае пакідаць лепшага. Потым мы даведваемся аб тым, што у героя ёсць пяцігадовая дачка Зіна і старэйшы сын Віця, які для свайго ўзросту надзвычай самастойны. Праз нейкі час аўтар пераносіць нас у сенцы, дзе ўрач “спыніўся, разглядаючы ў сівым ранішнім змроку, хто тут, пад вешалкаю, ляжыць на лаўцы”. Далей мы даведаемся аб тым, што гэта другая жонка Валетава.

Жыццё не пашкадавала ўрача: яго бацьку пасадзілі ў турму яшчэ тады, калі Валетаў быў хлапчуком, маці таксама рана памерла. Ажаніўшыся першы раз, яму не пашанцавала – першая жонка здрадзіла яму з мясцовым міліцыянерам, а пасля сышла ад Валетава з яго першынцам. Другая жонка аказалася маладзейшая за нашага героя на 20 год, аднак, апынуўшыся ў весцы, пачала піць і ў выніку спілася.

Потым аўтар апавядае нам аб тым, што раён, у якім жыве ўрач Валетаў і працуе ўчастковым урачом, знаходзіцца на тэрыторыі, якая найбольш пацярпела ў выніку аварыі на ЧАЭС. І тут мы можам ўбачыць усе недахопы таго перыяду, у які жыў урач Валетаў. Менавіта у гэты час да ўлады прыйшоў Міхаіл Гарбачоў і пачаў “перабудову”. Менавіта ў гэты час у краіне панаваў хаас і амаль безуладдзе. Аднак простым людзям хацелася жыць, і жыць прыстойна, нягледзячы на ўсё тое, што адбывалася навокал. Але ўлады не маглі забяспечыць людзям бяспеку, і тыя пераязджалі з аднаго месца на другое ў пошуках лепшага жыцця.

Адной з ключавых частак твора з’яўляецца аб’езд доктарам Валетавым бліжэйшых вёсак, якія ўваходзілі ў склад раёна, дзе ён працаваў. Вось тут аўтар паказвае, як марудна, але няўпынна вымiраюць вескі, як дэградуе мясцовае насельніцтва. У гэтай жа частцы аўтар паказвае нам, як урач бярэ хабар са сваіх пацыентаў, апраўдваючы гэта тым, што трэба карміць дзяцей.

У гэтай жа частцы мы даведваемся пра першае каханне доктара Валетава, пра сям’ю яго брата і шмат іншае, што дазваляе нам высветліць адносіны самаго аўтара да свайго героя, тыя абставіны, у якіх жыве і працуе ўрач Валетаў.

У завяршэнне я хачу сказаць, што твор В. Карамазава “Краем белага шляху” з’яўляецца адным з самых яскравых прадстаўнікоў беларускай літаратуры канца XX стагоддзя. У гэтым творы закрануты найбольш набалелыя тэмы таго часу, якія не згубілі сваёй актуальнасці і па сённяшні дзень. Таму спадзяюся, што мая праца дазволіць па-іншаму зірнуць на гэты твор, падштурхнуць перачытаць яго і задумацца над тым, які сэнс мы ўкладваем у такія словы, як Радзіма, сям’я, урач.

Рэпазіторый ГрГМУ